УДК 821.161.3.09 – 311. 9+821 (4).09–311.9

*Марина Аммон*
*(Беларусь)*

# ПОСТЧАЛАВЕК У БЕЛАРУСКАЙ І ЕЎРАПЕЙСКАЙ МАСТАЦКАЙ ФУТУРАЛОГІІ

У статті проаналізовано образ постлюдини в білоруській та європейській художній футурології відповідно до філософсько-естетичних концепцій письменників.

**Ключові слова:** футурологія, кассандрівський феномен, постлюдина, трансгуманізм, апокаліпсис, кіберпанк.

**Аммон М. В. Постчеловек в белорусской и европейской художественной футурологии.** Статья анализирует образ постчеловека в белорусской и европейской художественной футурологии в соответствии с философско-эстетическими концепциями отдельных авторов.

**Ключевые слова:** футурология, кассандровский феномен, постчеловек, трансгуманизм, апокалипсис, киберпанк.

**Ammon M. U. Post-human in Belarusian and European Fiction Futurology.** The paper is dedicated to a study of the posthuman image in Belarusian and European literatures by analyzing the writers' philosophical and aesthetic concepts.

**Key words:** futurology, Cassandra's phenomenon, posthuman, transhumanism, apocalypse, cyberpunk.

Любая мяжа, якую перасякае чалавецтва, мае сэнс толькі пры яе суаднесенасці з будучымі вынікамі згаданага акту. У сённяшнім сцыентысцка арыентаваным свеце больш-менш аб'ектыўнае вывучэнне асноўных тэндэнцый і перспектыў развіцця грамадства забяспечвае футуралогія. Спецыфікай дадзенага філасофскага падыходу да рэчаіснасці выступае той факт, што максімальна блізкім яе адпаведнікам у навуцы можна назваць гісторыю. Названая дысцыпліна збірае, дэталізуе і верыфікуе веды чалавецтва аб мінулых эпохах, па сутнасці, будуючы праўдзівую парадыгму падзей. Навука прагназавання ж займаецца канструяваннем альтэрнатыўнай рэальнасці, якая можа спраўдзіцца, калі будуць выкананыя пэўныя ўмовы.

У сучасным літаратуразнаўстве ўсё больш актуальным выступае пытанне існавання карэляцыі паміж касандраўскім пачаткам у прыгожым пісьменстве, яго здольнасцю да прадказання, і метадам

© *Аммон М. В., 2011*

экстрапаляцыі. Вышэй адзначаны факт, у сваю чаргу, дае магчымасць разглядаць навуку аб будучым ў яе непарыўнай сувязі з фантастыкай, што праяўляецца, перш за ўсё, у шырокім выкарыстанні паняцця “мастацкая футуралогія”. Адным з асноўных вектараў развіцця згаданай разнавіднасці вербальнага мастацтва выступае пытанне магчымых трасфармацый індывіда, абумоўленых шэрагам тэхнічных, натуральна-эвалюцыйных ды сацыяльных фактараў.

Варта заўважыць, што дадзеная тэматыка найбольш актуалізавалася ў вялікай колькасці сацыялагічных і гісторыка-філасофскіх работ (М. Гоффманн “Новы чалавек – постчалавек”, Ф. Фукуяма “Наша постчалавечая будучыня: Наступствы біятэхналагічнай рэвалюцыі”, Т. Часнакова “Постчалавек. Ад неандэртальца да кібарга” і ін.). Літаратуразнаўчая ж навука, нягледзячы на шырокі зварот да адзначанай праблемы многіх наратараў, дэманструе выбарчы падыход пры аналізе тых ці іншых з’яў трасфарматыўнай антрапалогіі.

Сярод замежных прац вылучаюцца кнігі амерыканскіх даследчыкаў М.К. Букер “Dystopian literature: a theory and research guide”, Д. Бэла “An Introduction to Cybercultures”, прысвечаныя характарыстыцы розных з’яў сучаснай культуры, аднак тым ці іншых чынам звязаныя з аглядам магчымых перспектыў далейшага развіцця людзей. Адной з магістральных тэм трактата С. Лема “Фантастыка і футуралогія” выступае аналіз паняццяў “чалавек” і “звышчалавек”. Дарэчы, пад апошнім тэрмінам вядомы пісьменнік, не падзяляючы цалкам пазіцыю Ф. Ніцшэ, разумее “не істоту <…> усёмагутную, а толькі чарговы крок эвалюцыі, які вядзе род ад Homo Sapience” [1, 297]. У артыкуле І. Талаконікава “80-я пад знакам кіберпанка” паралельна з разглядам прычын з’яўлення названага жанру, адметнасцей яго паэтыкі ажыццяўляецца спроба мастацкага асэнсавання асобы у яе дачыненні да здабыткаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, а таксама у сувязі з перспектывамі далейшага штучнага развіцця індывіда.

Сярод беларускіх опусаў трэба вылучыць даволі грунтоўную работу А. Паўлухіна “Кіберпанк з ужыўленым мікрачыпам”. Акрамя таго, спецыфіка рэалізацыі ідэі кланавання ў кантэксце аналізу творчасці пісьменніка Ю. Станкевіча прасочваецца на старонках працы В. Шынкарэнка “Асноўныя кірункі развіцця сучаснай беларускай прозы”.

Са сказанага вышэй вынікае, што паняцце постчалавека ў літаратуразнаўстве разглядалася ўрыўкава, фрагментарна, што прыводзіць да неабходнасці больш дэталёвага аналізу праблемы.

Такім чынам, мэта дадзенага даследавання – вызначыць асноўныя імператывы развіцця гіпатэтычнага вобраза людзей будучыні ў сучаснай беларускай і еўрапейскай мастацкай футуралогіі шляхам аналізу філасофска-эстэтычных поглядаў пісьменнікаў.

Дадзеная мэта рэалізуецца ў наступных задачах: 1) тэарэтычна асэнсаваць паняцце постчалавека ў кантэксце сучасных канцэпцый генезісу грамадства; 2) вылучыць асноўныя прынцыпы прагназавання і аксеалагічнай ацэнкі далейшай эвалюцыі Homo Sapience; 3) выявіць спецыфіку адлюстравання аўтарамі праблемы існавання ў соцыуме трохкутніка "Асоба-Прырода-Навука" і магчымых перспектыў функцыянавання адзначанага тандэму.

Індывід заўсёды разглядаўся заходняй культурай у дыяхранічным зрэзе як аб'ект, існаванне якога пастаянна накіравана ў заўтра. Пасля ж агульнай папулярызацыі ідэй эвалюцыі згаданы падыход быў канчаткова замацаваны і за навукай. На сённяшні дзень, згодна з класічнымі ўяўленнямі аб непарыўнай самаарганізацыі і перабудове экасістэм і біясферы ў цэлым, чалавек бачыцца структурным элементам у ланцугу пастаянных мадыфікацый, і яго статус Homo sapience многімі ўспрымаецца як пераходны этап да чарговай трансфармацыі.

Названая тэндэнцыя знайшла сваё адлюстраванне ў шэрагу еўрапейскіх навукова-фантастычных нарацый, адметным сярод якіх з'яўляецца раман А. Кларка "Канец дзяцінства". Цэнтральнае месца ў дадзеным творы адводзіцца апісанню далёкай будучыні тэхналагічнай цывілізацыі, што існуе ў гармоніі з акаляючай яе прыродай і згодна высокім маральным каштоўнасцям і этычным стандартам. Аднак гэтае вялікае дасягненне набывае ў тэксце рысы прымусовай каўзальнасці: на планету прыбыў касмічны карабель таямнічых дэмانападобных Звышкіраўнікоў, і менавіта пад іх настойлівым ціскам у грамадстве адбываюцца адпаведныя змены. Акрамя таго, жыццё соцыуму, што здолела дасягнуць максімальнага ўзроўню свайго развіцця, непазбежна набліжаецца да сітуацыю, ідэнтыфікаванай Ж. Бадрыярам як "стан пасля оргіі". Шчаслівыя жыхары чарговай Утопіі, няздольныя стварыць ніводнага новага артэфакта і вымушаныя скарыстоўваць ужо гатовыя дасягненні папярэдніх эпох, непазбежна накіроўваюць сваю экзістэнцыю, карыстаючыся словамі французскага філосафа, "у пустату, таму што ўсе канчатковыя мэты вызвалення засталіся за спіною, <...> [іх. – А.М.] неадступна пераследуе і мучыць прадба-

чанне ўсіх вынікаў, апрыёрнае веданне ўсіх знакаў, форм і жаданняў" [2, 8]. Адзінае выйсце пры такіх умовах – імітацыя вынаходніцтва, бясконцая рэканструкцыя даўно забытых ісцін і, на больш позняй стадыі, разбурэнне наяўнай культуры праз дэградацыю з наступным паўтарэннем пройдзенага (спіральная мадэль гісторыі) ці далейшую эвалюцыю (лінейны сцэнарый). Менавіта апошні варыянт рэпрэзентаваны ў творы англійскага пісьменніка: новае пакаленне дзяцей Зямлі адзін за адным пачынае ментальна-разумовае самазмяненне. Чыстая і неабцяжараная трывіяльнымі клопатамі дарослых свядомасць tabula rasa аказалася здольнай падпарадкаваць матэрыяльны свет сіле думкі, а пасля і поўнасцю адмовіцца ад біялагічнай абалонкі і наблізіцца да боскага статусу.

Нягледзячы на відавочны песімізм, з якім аўтар малюе апакаліптычную карціну смерці Homo sapience, наратар сцвярджае неабходнасць такога пераходу. Бо, як становіцца зразумелым пры больш дэталёвым знаёмстве з творчасцю А. Кларка (дадзены раман, а таксама больш позні тэкст "Зямля імперская"), сучасны тэхналагічны шлях развіцця цывілізацыі не падаецца наратару ідэальным варыянтам і характарызуецца як тупіковы.

Варта заўважыць, што прадстаўленая брытанскім аўтарам мадэль натуральнай эвалюцыі чалавека для многіх сучасных навукоўцаў бачыцца досыць ілюзорнай і пазбаўленай неабходнай аб'ектыўнасці. Прычына хаваецца ў выдатнай здольнасці асобы да адаптацыі, а таксама падпарадкавання акаляючага асяроддзя сваім патрэбам. Таму яе біялагічнае ўдасканаленне многім падаецца немагчымым без паляпшэння адпаведных галін тэхнікі. Філасофскім базісам такога падыходу з'яўляецца трансгуманізм (сістэма поглядаў, згодна з якой індывід успрымаецца як аб'ект штучнага змянення), а літаратурным увасабленнем – жанр кіберпанка.

У беларускім мастацтве слова ідэя бясконцай мадыфікацыі людзей з дапамогай усіх магчымых сродкаў трансфармацыі цела і свядомасці (ад выкарыстання нанаробатаў да поўнага зліцця розуму і кампутарнай сістэмы) гучыць на старонках апавяданняў маладога пісьменніка А. Паўлухіна. Так, напрыклад, у яго апавяданнях "Стальныя арлы", "Кроў і восень" разглядаюцца пытанні аб магчымасці гранічнага расслаення чалавецтва на бессмяротную, амаль усемагутную эліту і падкантрольную ёй, пазбаўленую згаданых прывілеяў масу, аб пагрозе знікнення ў грамадстве традыцыйнай маралі і

дэмакратыі, а таксама аб генетычным самаўдасканаленні, а разам з ім і высакамернай гульні асобы ў звышістоту, бога. Свет вышэй адзначаных тэкстаў пабудаваны на аснове веры ў перспектыўнасць развіцця новых тэхналогій, асабліва распрацовак у галіне штучнага інтэлекту, інтэграцыі свядомасці і памяці кампутара.

Постчалавек, згодна з пазіцыяй аўтара, жыве ў ненатуральным свеце, у якім Homo sapience перамог хваробы і смерць, але разам з гэтым пазбавіўся здольнасці да экзістэнцыйных духоўных канфліктаў. Усё навокал, заўважае галоўны герой абодвух твораў, працягвае сваё функцыянаванне нават тады, калі сэнс існавання даўно знік.

На прыкладзе Кайна, імя якога ўтрымлівае даволі празрыстую алюзію на біблейскі тэкст, аўтар робіць спробу асэнсавання псіхалогіі людзей ва ўмовах поўнай сегрэгацыі – падзелу соцыума на два адрозныя класы пры свядомым абмежаванні кантактаў паміж імі. Так, у апавяданні "Кроў і восень" створаны наратарам персанаж падчас чарговага ваеннага задання трапляе ў палон да жыхароў аднаго горада, якія, у адрозненне ад яго, не з'яўляюцца бессмяротнымі. Ён з жахам заўважае сляды татальнага разбурэння, голад і беднасць, якія пануюць у дадзенай мясціне. Відавочная неадпаведнасць афіцыйнай версіі наконт вядзення вызваленчай вайны рэальнаму жыццю стала прычынай разумення героем сваёй страшнай ролі ў працэсе знішчэння аўтэнтычнай культуры. Аднак духоўны парыў Кайна сутыкаецца з варожым стаўленнем гараджан да яго як да заваёўніка. Канфлікт застаецца нявырашаным: персанажа забіваюць, а яго чарговы клон чакае абуджэння з мэтай адпомсціць за сваю смерць.

Неад'емнымі кампанентамі магчымай будучыні тэхнагеннага грамадства, на думку пісьменніка, з'яўляюцца дэгуманізацыя, абыякавасць да любых праяў індывідуальнага, нізкі ўзровень жыцця, поўная дэградацыя маральнасці, прызнанне людзей недасканалымі істотамі і рознабаковыя іх мадыфікацыі, за якімі даволі часта губляецца сам чалавек.

У кантэксце развіцця жанру біяпанка з уласцівай яму ўвагай да праблемы выкарыстання дасягненняў геннай інжынерыі, што знаходзіцца на памежжы паняццяў "навука" і "прырода", адметнае месца займае аповесць В. Гігевіча "Пабакі". У дадзеным творы аўтар звяртаецца да пытання прагназавання магчымых вынікаў разгортвання эксперыментаў па стварэнні звышістот. Аднак практычная рэалізацыя

ідэй трансгуманізму, у адрозненне ад прааналізаваных вышэй твораў, набывае ў аповесці акцыдэнтныя рысы.

Так, па прычыне некампетэнтнасці ці няўважлівасці супрацоўніка Інстытута генетыкі трапляе ў каналізацыю эксперыментальны раствор з эмбрыёнамі пабакаў – пачвар, што ўяўляюць сабой гібрыд пацука і сабакі (адсюль і назва). Яны, па некаторых звестках надзеленыя розумам, за кароткі тэрмін распаўсюдзіліся па ўсяму Гораду і, імкліва размнажаючыся, пачалі выцясняць Homo sapience з роднага для яго арэалу існавання. Замест таго, каб аб'яднаць свае намаганні ў барацьбе з захопнікамі, людзі адаптаваліся да новых умоў, прыстасаваўшы сваё жыццё да звычак і нораваў уласнаручна вынайдзеных монстраў і пачаўшы працаваць на задавальненне іх фізіялагічных патрэб.

Варта сказаць, што сімвалічная прырода створаных В. Гігевічам істот відавочная. У першую чаргу, іх можна трактаваць у якасці фантомаў самога чалавецтва з яго разбуральным жаданнем падпарадкаваць сабе ўсё жывое на Зямлі. Па-другое, даволі лагічным з'яўляецца атаясамліванне дадзеных істот з матэрыялізаваным прадуктам тэхнагеннага грамадства. Трэцім, безумоўна, аптымістычным, але найбольш адарваным ад сапраўднасці варыянтам разумення згаданага вобраза выступае разгляд жыхарамі Горада пабакаў як прадвеснікаў новага, лепшага пакалення людзей.

Пытанне магчымых наступстваў маніпулявання прыродай Homo sapience на генетычным узроўні гучыць на старонках апавядання польскага пісьменніка А. Зямянскага "Аўтабан нах Познань". У творы паралельна з распрацоўкай адзначанай вышэй тэматыкі рэпрэзентаваны даволі арыгінальны шлях вырашэння спрадвечнай праблемы аднаўлення Рэчы Паспалітай "ад мора да мора", вяртання айчыне вядучых пазіцый у еўрапейскага гісторыі.

Створаны наратарам свет уяўляе сабой непрыглядную карціну бадай што апошніх дзён Зямлі. Пасля чарговай планетарнай вайны і выбуху кітайскай авіябомбы Чэн грамадства была пазбаўлена асноўнага рухавіка наперад – электрычнасці. Усе ізалятары незразумелым чынам пераўтварыліся ў праваднікі, і соцыум быў назаўсёды адкінуты ў далёкае тэхналагічнае сярэднявечча. Безумоўна, засталіся і пэўным чынам выкарыстоўваліся веды па хіміі і біялогіі, аднак гэта не здолела даць цывілізацыі тую перавагу над сіламі прыроды, якую ёй прапаноўвала тэхніка. Рэшткі чалавецтва раздзірае бясконцая

вайна з мутантамі, недахоп ежы і вады, маральна-этычная дэградацыя. Галоўны герой твора Анджэй Вагнер жыве ў своеасаблівым Эдэме новага часу – падземным Вроцлаве. Па сутнасці, названы горад становіцца адной з нямногіх надзей на магчымае аднаўленне былой моцы навукі, чароўнай Мекай для ўсіх пакутнікаў будучага.

Дадзены момант у спалучэнні з імкненнем пісьменніка максімальна праўдзіва апісаць свет пасля катастрофы набліжае апавяданне да жанру постапакаліптыкі, заснаванай на ідэі прагназавання тых ці іншых шляхоў развіцця чалавечай суполкі пасля пэўнага катаклізму. Латэнтная схільнасць людзей да анархіі, стыхійнага знішчэння сябе і свайго наваколля, на думку пісьменніка, маюць усе магчымасці перайсці ў актыўны стан, асабліва пасля разбурэння пэўных сацыяльна-палітычных межаў утрымлівання прыроды Homo sapience.

Разам з тым, прыём канструявання магчымай рэальнасці выкарыстоўваецца наратарам з мэтай больш глыбокага разгляду канкрэтных праблем сучаснасці без звароту да другарадных, менш істотных пытанняў. Будучыня, намаляваная польскім аўтарам, пазбаўлена характэрнай для максімальна развітай цывілізацыі ўкладненай дыхатамічнай мадэлі дабра і зла, у межах якой рэчы (у тым ліку і індывід) страчваюць свой канататыўны "баласт" і рэпрэзентуюць чытачу сваю першасную і далёка не заўсёды пазітыўную існасць.

Так, атрымаўшы неверагодны шанец выпраць памылкі мінулага ўсяго чалавецтва з дапамогай машыны часу, персанажы твора робяць нечакае: выпускаюць ў далёкім 2002 годзе антыэлектрычны канцэнтрат. Матывацыя дадзенага ўчынку гучыць у словах кіраўніка аперацыі генерала Барылы: "Я же привез знания, великолепные паровые машины, экстрахимию, суперлекарства и семена, какие им и не снились. <…> К тому времени, когда американцы сумеют построить тысячи пароходов, чтобы перевезти войско через океан, Польша будет занимать пространство от Атлантики до Тихого океана. От Полярного круга до Средиземного моря!" [4].

На жаль, не кожны індывід мае магчымасць стаць асобай. Для многіх адзіным выйсцем ва ўмовах постапакалістычнага існавання з'яўляецца татальная дэградацыя маральна-этычнага аспекту жыцця дзеля забеспячэння біялагічнага функцыянавання, няхай і пад эгідай адраджэння велічы асобнай узятай нацыі.

З вышэй адзначанага вынікае, што ў вербальным мастацтве XX ст. актуалізуецца тэндэнцыя да актыўнага даследавання пісьменнікамі

вобраза постчалавека ў двух асноўных кірунках. Сутнасць першага складае эсхаталагічны роздум аўтараў над трагічнай прыродай людзей, глыбокае разуменне абранага апошнімі тэхналагічнага шляху як нерацыянальнага і тупіковага па сваёй сутнасці (А. Кларк "Канец дзяцінства").

Спецыфікай зместавага плана тэкстаў другой групы з'яўляецца крытычнае асэнсаванне магчымасцей эвалюцыі асобы, спробы прадказання вынікаў рэалізацыі тэорыі фізічнага і інтэлектуальнага самаўдасканалення Homo sapience з дапамогай штучных метадаў і без увагі да духоўнага развіцця кожнага асобнага індывіда (нарацыі В. Гігевіча, А. Зямянскага, А. Паўлухіна). Аднак абодва сцэнары сыходзяцца ў адным: мадыфікацыя чалавека, натуральная альбо штучная, непазбежная, як і зменлівасць усяго існага на Зямлі.

### *Література*


1. Лем С. Фантастика и футурология : в 2 кн. Кн. 2. / С. Лем ; [пер. с пол. Е. П. Вайсброта, под ред. В. И. Борисова]. – М. : АСТ ; Хранитель, 2008. – 667 с.
2. Бодрийяр Ж. Прозрачность зла / Ж. Бодрийяр ; [пер. с фр. Л. Любарской, Е. Марковской]. – М. : Добросвет, 2000. – 257 с.
3. Кагарлицкий Ю. Что такое фантастика / Ю. Кагарлицкий. – М. : Худож. лит., 1974. – 352 с.
4. Землянский А. Автобан нах Познань [Электронный ресурс] / А. Землянский. – Режим доступа : http://fan.lib.ru/k/kudrjawcew_1_w/text_0030.shtml


УДК 82.092

*Лілія Богачевська*
*(м. Івано-Франківськ)*

# АДЕКВАТНІСТЬ ВІДТВОРЕННЯ ОБРАЗУ ОРИГІНАЛУ "РІЗДВЯНОЇ ПІСНІ У ПРОЗІ" Ч. ДІККЕНСА В УКРАЇНСЬКИХ СУЧАСНИХ ПЕРЕКЛАДАХ ІВАНА АНДРУСЯКА Й ОЛЕКСАНДРА МОКРОВОЛЬСЬКОГО (ІМАГОЛОГІЧНИЙ АСПЕКТ)

У статті здійснено компоративний аналіз сучасних українських версій перекладу "Різдвяної пісні у прозі" Ч. Діккенса. Проаналізовано лексико-граматичні трансформації, відповідність відтворення в перекладах авторського стилю та "духу" оригіналу, подано художньо-естетичну характеристику досліджуваних явищ.

**Ключові слова:** оригінал, переклад, лексико-граматичні трансформації, адекватне відтворення, відповідність.

© *Богачевська Л. О., 2011*